Рыштаванні

НОВЫЯ КОНТУРЫ СТАРАЖЫТНАГА БРОВАРА

На рэканструкцыю гістарычнага комплексу плануецца выдаткаваць больш чым восем мільёнаў долараў

ГАЛОЎНАЯ задача — захаваць аўтэнтычнае аблічча аднаго з самых знакамітых аб'ектаў Гродна. І з гэтай мэтай падрадчыкі паспяхова спраўляюцца. Былы бровар аднаўляецца проста-такі на вачах. Згодна з праектам, тут праходзіць рэканструкцыя пад вялікі фудкорт з дзясяткамі арандатараў. Але не толькі. Мяркуецца, што на тэрыторыі былога бровара з'явяцца бізнес-цэнтр, музей піва, міні-піваварня, гандлёвыя павільёны. Усе будынкі будуць аб'яднаны паміж сабой галерэямі. Першых наведвальнікаў рыхтуюцца прыняць у канцы года.

Важны аб'ект

Прадстаўнікі адміністрацыі інвестыцыйнай кампаніі праводзяць журналістаў па тэрыторыі комплексу. Адзін з галоўных аб'ектаў — двухпавярховы будынак, у мінулым — палац канца XVII стагоддзя, які належаў роду Сапегаў, затым Агінскіх. Па словах нашага гіда, **намесніка дырэктара ААТ «МБА Інвестмент» Аляксандра ЗАГЛУБОЦКАГА,** частка палацавых сцен адноўлена падчас апошніх рэканструкцый. Іх праводзіў тагачасны гаспадар комплексу аўстрыец Кунц, які перабудаваў яго пад бровар у XIX стагоддзі. Такім чынам, прамысловае прадпрыемства будавалася на рэштках палаца. Але ёсць і яшчэ больш ранні перыяд пабудоў. Падчас работ выявілі скляпы, на якіх, магчыма, размяшчаліся вежы. А самі склепы былі прыстасаваны Кунцам пад склады.

У зону фудкорту ўвойдуць дзясяткі арандатараў з рэстаранамі, кавярнямі, барамі. Тут размесціцца піваварня, а ў скляпах — музейная экспазіцыя. Усе знаходкі падчас рэканструкцыі будуць упісаны ў інтэр'ер.

— Мы бачым, што ў працэсе перабудовы палаца ў піваварню многае засталося. Калі пачалі адкрываць замазаныя праёмы, атрымалі амаль што архітэктуру палаца. Зразумела, што мы гэта ўсё ўлічвалі пры рэканструкцыі, — расказаў Аляксандр Заглубоцкі.

Каб дабрацца да старажытнай эпохі, многае прыйшлося расчысціць. Тоўстыя пласты тынкоўкі клаліся ўжо ў савецкі перыяд, калі тут была наладжана вытворчасць піва. У 1970-х гадах з-за старога абсталявання завод закрылі. А сам комплекс паступова разбураўся. Тое, што інвестар прыйшоў сюды, для горада вельмі важная падзея. Аб'ект ужо быў аднойчы няўдала прададзены, але работы тут амаль не вяліся. Новы інвестар мяркуе давесці справу да канца.

— Вы бачыце, што мы расчысцілі тэрыторыю, тут былі шматлікія пабудовы савецкага перыяду, яны не маюць гістарычнай і архітэктурнай каштоўнасці, таму мы іх зносім, а тэрыторыю расчышчаем, — расказаў наш гід.

Гісторыя ў скляпах і экспанатах

Экскурсія па старым піўзаводзе працягваецца. Удзельнікі прэс-туру стараліся па максімуме даведацца аб аўтэнтычных кутках і нават пабываць там.

Спуск у глыбокі склеп яшчэ той атракцыён. «Там можна звалiцца, асцярожна», — папярэджвае наш гід.

І ўсё ж адмовіцца ад прапановы ніхто не збіраўся. І вось вакол нас сцены аж XVII стагоддзя! «Гэта гісторыя, якой тут не бачылі больш чым 200 гадоў, мы знайшлі сходы ў склеп падчас работы і зараз мы знаходзімся на месцы былой вежы», — заўважае Аляксандр Заглубоцкі.

Цяпер тут поўнасцю адноўлена ў арачным выглядзе гістарычная столь. Наверсе некалі быў палац, а затым першы ў горадзе броварны завод. Такіх скляпоў тут некалькі, як і саміх пабудоў. Праўда, усе яны розных перыядаў. Адзін з аб'ектаў узводзіцца нанова, але з улікам агульнай канцэпцыі. У новым варыянце будуць задзейнічаны і скляпы.

Дарэчы, знутры ўжо бачныя контуры будучага двухпавярховага рэстарана з гістарычнымі чыгуннымі апорамі. У аўтэнтычным выглядзе захаваецца і лесвіца XIX стагоддзя. Пашкоджаныя элементы аднаўляюцца з ювелірнай дакладнасцю з дапамогай 3D-макета. Тэхналогія тынкоўкі таксама адпавядае аўтэнтычнасці.

— Мы тынкуем вапнай, як гэта было раней, устаўляем драўляныя вокны, якія былі раней, стараемся ісці па праектах гістарычнага профілю. Для нас важна адлюстраваць магчымы выгляд палаца, бо яго ніхто ніколі не бачыў, а гісторыкі стварылі прыблізную яго копію. Мы адкрыем кладку XVII стагоддзя. Большая частка работы зроблена, — зазначае наш спадарожнік.

У будынку заўважаем цэлы шэраг старых бутэлек. Аказалася, іх знайшлі ў старых скляпах. Магчыма, гэта бутэлькі піваварні Кунца, але ёсць і найноўшага часу — 20-30-х гадоў XX стагоддзя. Яны так і будуць экспанавацца — з пацінай на шкле. Іх размесцяць па ўсім будынку на спецыяльных падстаўках. Будзе тут і шкляная падлога з відам на сутарэнні склепа.

І арандатарам, і гасцям

— Чаму кампанія-інвестар зацікавілася гэтым аб'ектам? — задаём пытанне прадстаўніку адміністрацыі. Аказалася, камерцыйнай тайны тут няма, а ёсць цвярозы разлік і жаданне зрабіць штосьці важнае для горада. І ўсё ж падступіліся да яго не адразу. Прыходзілі, вывучалі гісторыю, пралічвалі плюсы і мінусы. У кампаніі разумелі, што комплекс патрабуе даволі значных фінансавых выдаткаў.

— Пачаўся пошук інвестараў, якія згадзіліся б укласці сюды сродкі. Вельмі радуе, што гэтымі інвестарамі сталі жыхары Гродна. І тады мы пачалі актыўна распрацоўваць канцэпцыю, затым праект, вывучалі гістарычныя моманты, глыбока ў гэта ўвайшлі. Пасля праз аўкцыён набылі гэты комплекс і пачалі ім актыўна займацца. Канцэпцыя, вядома, мянялася некалькі разоў, таму што напачатку бачылі будынак з аднаго боку, а калі ўжо больш шчыльна заняліся, раскрылася гістарычная частка. Бачым, што гэта не завод, а палац, хоць па дакументах лічыцца як будынак старажытнай піваварні. Таму і канцэпцыя рэканструкцыі таксама пачала мяняцца, — пракаментаваў Аляксандр Заглубоцкі.

Такія моманты ўплываюць і на тэрміны работ. Яны зацягваюцца. Між тым мяркуецца, што наведвальнікі змогуць ацаніць новы комплекс ужо напрыканцы года. Што яны тут змогуць убачыць?

Па словах нашага суразмоўца, гэта будзе вялікі аб'ект грамадскага харчавання. Прычым на любы густ і кашалёк. Але для арандатараў таксама будуць прад'яўляцца ўмовы па захаванні стылю гістарычнага аб'екта. «Важна, каб яны ўпісваліся ў гэту канцэпцыю, а не проста лічылі месца хайповым», — заўважае суразмовец.

У зону фудкорту ўвойдуць дзясяткі арандатараў з рэстаранамі, кавярнямі, барамі. Тут размесціцца піваварня, а ў скляпах — музейная экспазіцыя. Усе знаходкі падчас рэканструкцыі будуць упісаны ў інтэр'ер.

— Мы сваёй архітэктурай хочам вярнуць былое аблічча і веліч гэтаму аб'екту, які годна ўпрыгожыць старажытны горад, — заўважае наш гід.

Вядома, значным плюсам стала размяшчэнне палаца-бровара. Гэта гістарычны цэнтр, больш таго, набярэжная Нёмана, побач — старажытны замкавы комплекс, прыгожыя віды на раку. Рыхтуюцца эскізы па сумяшчэнні комплекса з паркавай зонай і выхадам да Нёмана. У далейшых планах — будаўніцтва гасцініцы на 120 нумароў.

У тэму

Як паведамілі ў аддзеле эканомікі Гродзенскага гарвыканкама, новы праект ацэньваецца гарадскімі ўладамі як вельмі маштабны. Роўных яму няма ва ўсім СНД. І па кошце таксама выглядае салідна. Па папярэдніх падліках рэканструкцыя былога бровара абыдзецца ў 7-8 мільёнаў долараў. Гэта адзін са 116 аб'ектаў, якія рэалізуюцца ў горадзе малым і сярэднім бізнесам.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.